**АНАЛІЗ УРОКА** – адзін з відаў метадычнай працы ў школе, у аснове якой ляжыць разбор і ацэнка праведзеных заняткаў. Для аналіза ўрока няма універсальнай схемы, бо ўрокі па розных прадметах і на розных ступенях навучання вельмі разнастайныя. Пры аналізе ўрока мовы і літаратуры звычайна разбіраюцца наступныя пытанні: арганізацыйная асаблівасць урока; агульнаадукацыйнае значэнне ўрока; выхаваўчае значэнне ўрока; развіццё пазнавальных здольнасцей вучняў на ўроку; сувязь праграмнага матэрыялу з іх жыццёвым вопытам; месца дадзенага ўрока ў сістэме ўрокаў па тэме; змест і структура ўрока; выкарыстанне метадаў і прыёмаў навучання на ўроку; рэалізацыя агульнадыдактычных прынцыпаў свядомасці, трываласці, сістэмнасці, даступнасці; адпаведнасць матэрыялу навейшым дасягненням літаратуразнаўчай навукі; абсталяванне ўрока нагляднымі дапаможнікамі і тэхнічнымі сродкамі навучання; развіццё разумовай актыўнасці і цікавасці школьнікаў да прадмета; улік і ацэнка ведаў вучняў; дзейнасць вучняў на ўроку, ступень іх актыўнасці, ступень цяжкасці і памер дамашняга задання; праяўленне творчай індывідуальнасці і такт настаўніка.

Мэта аналіза ўрока – аказанне метадычнай дапамогі настаўніку і кантроль за яго працай. Аналіз урока звычайна праводзіцца намеснікам дырэктара па вучэбнай працы, дырэктарам школы і метадыстам раённага аддзела адукацыі.

Пры аналізе ўрока ўлічваюцца асабістыя якасці настаўніка, яго ўзрост, характар і вопыт працы. Заўвагі і прапановы выказваюцца ў добразычлівай форме, абавязкова адзначаецца ўсё станоўчае на ўроку.

У педкаледжах і педуніверсітэтах аналіз урока выкарыстоўваецца як сродак падрыхтоўкі студэнтаў да педагагічнай дзейнасці.

Аналіз урока прымяняецца таксама для навуковых даследаванняў.